Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, ПРАФКОМАЎ, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА
ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

№ 11 (135) Серада, 4 красавіка 1990 года

## Віншуем!



Іван Платонавіч Мартынаў, загадчык кафедры матэматычнага аналіза, дацэнт, паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю. Тэма яго навуковай працы — «Аналітычныя ўласцівасці ўраўненняў і сістэм трэцяга парадку».

Амаль што 10 год выкладчык плённа, творча і крапатліва працаваў над распрацоўкай гэтай тэмы. «Ведаеце, можа не вельмі дакладна вызначаны гады, але я не памылюся, калі скажу, што ўсё сваё жыццё, свае сілы, веды і ўменні прысвяціў напісанню работы».

Добрыя адносіны склаліся паміж І. П. Мартынавым і студэнтамі матэматычнага факультэта. Іван Платонавіч заўсёды растлумачыць незразумелае пытанне, дапаможа вырашыць складаныя матэматычныя задачы.

З гэтага таленавітага выкладчыка і цудоўнага чалавека малодшыя сябры бяруць прыклад. Трэба адзначыць, што тэма дысертацыі — дзяржразліковая. І таму дыпломныя, курсавыя работы студэнтаў з'яўляюцца яе неад'емнай часткай.

## АБМЯРКОЎВАЕМ ПРАЕКТЫ ПАРТЫЙНЫХ ДАКУМЕНТАЎ

# Улічваючы думкі камуністаў

Шмат падзей адбылося ў партыі за тры месяцы гэтага года. Апублікаваны праект платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі.

Прайшло яго абмеркаванне на партыйных сходах структурных падраздзяленняў універсітэта. Выказваліся розныя меркаванні наконт гэтага дакумента, было шмат прапаноў. Але сёння трэба адзначыць, што мы былі ў гэтым не адзінокія — такія ж прапановы і заўвагі былі і ў выступленнях удзельнікаў сакавіцкага (1990 г.) Пленума ЦК КПСС.

У ходзе абмеркавання супастаўляліся таксама два праекты дакументаў — Платформа ЦК КПСС і Дэмакратычная платформа. Калі не ўдавацца ў падрабязнае абмеркаванне гэтых дакументаў, хачу выказаць наступнае.

Не трэба бачыць ў Дэмакратычнай платформе толькі недахопы (хаця іх там шмат і не з усімі яе палажэннямі я асабіста згодны). Трэба пастарацца ўзяць з яе ўсе тыя ідэі, якія могуць узбагаціць і ўзмацніць пазіцыі КПСС у нашым грамадстве. Многія ідэі ўжо знайшлі сваё адлюстраванне ў нядаўна апублікаваным праекце Статута КПСС.

На мой погляд, абмеркаванне, якое ўжо адбылося, дазваляе ЦК КПСС апублікаваць праект № 2 Платформы да XXVIII з'езда партыі. Такі падыход і ў далейшым дазволіў бы перыядычна абнаўляць гэты дакумент, і да з'езда мы прыйшлі б з больш дасканальным праектам, чым той, які атрымалі.

Хачу адзначыць, што асабіста мяне не задаволіў праект Платформы ЦК КПСС да XXVIII з'езда партыі. Так, гэта крок наперад. Але там замацавана ўсё тое, што сёння ў многім рэальна існуе ў жыцці. А што будзе далей? Дзе прагноз развіцця падзей? Дзе механізм, які забяспечыць выкананне пастаўленых мэт? І шэраг гэтых пытанняў можна прадоўжыць. Адказы на іх трэба шукаць усім разам.

Не менш пытанняў узнікае і пасля азнакамлення з праектам Дэмакратычнай платформы. Асабіста мяне ён таксама не задавальняе. Ёсць неабходнасць шукаць кампраміс там, дзе гэта магчыма, паміж двума крайнімі пунктамі гледжання па тых або іншых пытаннях.

Апублікаваны зусім нядаўна праект Статута КПСС задаволіў мяне ў большай меры, чым праект Платформы, адобраны лютаўскім Пленумам ЦК КПСС. Хаця і тут ёсць пытанні.

Напрыклад, у прэамбуле КПСС вызначаецца як добраахвотнае аб'яднанне аднадумцаў-камуністаў. Але аб тым, хто такі аднадумец-камуніст, праект Статута не гаворыць ні слова.

Дзіўна, што, зыходзячы з камуністычнай перспектывы, КПСС ставіць сваёй мэтай стварэнне ў краіне гуманнага, дэмакратычнага сацыялізму... Пытанне ўпіраецца ў адпаведнасць мэт партыі і яе назвы.

На мой погляд, ёсць неадпаведнасць у параграфах 7 і 13. З аднаго боку — «партыйныя арганізацыі самастойныя ва ўладкаванні свайго ўнутранага жыцця і дзейнасці. Іх рашэнні, калі яны не супярэчаць праграмным мэтам і нормам Стутата КПСС, не могуць быць адменены вышэйстаячымі органамі...». З другога боку— «Рашэнні партыйных органаў абавязковыя для ніжэйстаячых арганізацый». А калі партыйная арганізацыя ў поўных суадносінах з Праграмай і Статутам першай прыняла рашэнне па якому-небудзь пытанню, якое супярэчыць рашэнню вышэйстаячага партыйнага органа, таксама прынятага ў суадносінах з Праграмай і Статутам? Якое з гэтых рашэнняў павінна выконвацца?

Не было б лішнім усё ж вызначыць асноўныя напрамкі работы, па якіх партыйныя органы будуць ствараць камісіі. Гэтае ж пытанне ўпіраецца, у сваю чаргу, у напрамкі работы ўсёй партыі. На мой погляд, іх чатыры і яны пералічаны ў Дэмакратычнай платформе.

Пералік падобных пытанняў можна было б прадоўжыць. Мяркую, што іх узнікне нямала ў ходзе будучага абмеркавання Статута КПСС.

У адпаведнасці з рашэннямі апошняга Пленума ЦК КПБ справаздачы і выбары ў нашай рэспубліцы пройдуць пасля з'езда. Напярэдадзе выбары новага саставу партыйнага камітэта дзяржаўнага універсітэта. Вельмі важная і надзвычай адказная падзея. Тым больш, што сёння, у час перабудовы, партыйнаму цэнтру камуністаў належыць быць больш баявым і актыўным.

**В. ПЧЭЛЬНІК,**
**сакратар партыйнага камітэта універсітэта.**

## АБ ТЫМ, ШТО ТРЫВОЖЫЦЬ

# Ці аб гэтым марылася?

На 5 курсе філалагічнага факультэта ідзе канчатковае размеркаванне. Людзі хвалююцца ля аудыторыі. Нязвыкла ціха, нават размаўляць няма жадання... І адразу прыйшлі ўспаміны аб размеркаванні на філфаку ў мінулым годзе. Ці прыемныя яны, успаміны пра той дзень, калі практычна вырашаецца твой лёс на 3 гады ўперад?

Памятаю, як кожны з нас спадзяваўся на ўсмешку лёсу, на тое, што менавіта яму прызначана хоць не лепшае месца сярод усіх магчымых, але ў недалёкім ад горада мястэчку, у добраўпарадкаванай сярэдняй школе, з нармальным памяшканнем для жылля. 2 чалавекі — Магілёўская, 2 — Віцебская, Мінская вобласці — вось чаго асабліва баяліся, ніхто не жадаў уявіць сябе на месцы тых настаўнікаў...

Вядома, амаль усе загаддзя стараліся «падрыхтавацца» да гэтай падзеі: нехта паспеў выйсці замуж, нават нарадзіць дзіця — спадзяецца на тое, што камісія прызначыць самастойнае размеркаванне (дасць так званы «свабодны» дыплом), нехта неўзабаве прыносіў спраўкі аб хваробе бацькоў, якіх патрэбна пастаянна даглядаць... Ужо пасля размеркавання мы казалі адзін аднаму, што менавіта ў гэтыя дні добра пазнаёміліся...

Першыя ў спісах студэнты выходзілі з аудыторыі з радасным настроем: камсамольская работа, работа ва універсітэце, аспірантура, месца дырэктара ў адной з раённых школ. Астатнія проста з зайздрасцю глядзелі ім услед, і з жахам — на дзверы.

Будзем шчырымі: нямногія ў агульным ліку марылі працаваць настаўнікамі, але ж такія былі: людзі, якія імкнуліся стаць «сейбітамі разумнага, добрага, вечнага», хто з першых і да апошніх дзён вучобы ва універсітэце марыў аб гэтым, хто плённа і самааддана працаваў у піянерскім лагеры, у час педагагічнай практыкі ў школе, каго па-сапраўднаму любілі дзеці і цягнуліся да іх усёй сваёй дзіцячай душой: С. Казейка, Г. Олісава, А. Самуйлава, А. Гаўрыленка, Г. Кавалеўская, Н. Гірда, Г. Якубель. І як было непрыемна і балюча такім людзям, калі яны, будучы лепшымі і па колькасці балаў, не мелі права выбраць для сябе месца пры размеркаванні. Навошта тады ўвогуле падлічваць гэтыя балы, каму яны патрэбны? Здарылася так, што добрыя школы заставаліся зусім не такім дзяўчатам...

Хапіла ў гэты дзень і слёз, і незадаволенасці. Напрыклад, такі штрых да карціны. Жанчына —студэнтка мае дзіця да трох гадоў, муж яе — студэнт гістарычнага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы. Яна размяркоўваецца ў Магілёўскую вобласць. Чаму ж не мае права на самастойныя пошукі работы, калі ў яе такое становішча?

І вось размеркаванне ў нас засталося ў мінулым. Што мы маем? Хто і дзе працуе? У Магілёве — толькі 1 чалавек, у вобласці — ніводнага. Многія добра ўладкаваліся ў Гродна. Вось адно вельмі засмучае. Здавалася б, школа ў абласным цэнтры: толькі працуй. Але цераз некалькі месяцаў (я не буду называць прозвішчы) збегла са школьнага «пекла» у большменш спакойны дзіцячы садзік большасць выпускнікоў!

А аб чым гавораць тыя, хто працуе, аддаючы ўсе сілы вучням? Катастрафічна не хапае метадычнай падрыхтоўкі, як па літаратуры, так і па мове. Праўда, некаторыя настаўнікі-стажоры з удзячнасцю ўспамінаюць педпрактыку і школьных настаўнікаў, якія змаглі навучыць пісаць канспекты ўрокаў, правільна весці дакументацыю, умела працаваць з дзецьмі ў ролі і настаўніка-прадметніка, і класнага кіраўніка. На жаль, мае таварышы — былыя студэнты філфака — змаглі вызначыць і сказаць вялікае «дзякуй» за веды толькі Але Яўгенаўне Чайко, настаўніцы рускай мовы і літаратуры СШ № 23 г. Гродна, якая разам з тым чытала на 4 курсе методыку выкладання рускай мовы на высокім узроўні.

Ці дапамагаюць канспекты лекцый, праслуханых ва універсітэце, рыхтавацца да працоўнага школьнага дня? Кажуць, амаль што не, вельмі мала. Адрозніваецца праграма ў школе ад універсітэцкай. Толькі зараз, пасля заканчэння, мы адчулі, што літаратуры не ведаем наогул, мовы — таксама. Затое добра наведвалі медыцыну і фізічнае выхаванне, заўжды старанна рыхтаваліся да практычных па замежнай мове.

Цяжка працаваць першы год. Калі плюс да ўсяго прыбаўляецца класнае кіраўніцтва, ды і ў старэйшых класах...

І як вынік: увесь дзень і ноч у галаве — толькі школа, канспекты, класны журнал. Няма цікавасці да працы. Да працы, да якой няма належнай падрыхтоўкі ва універсітэце. І нарэшце, жаданне працаваць у школе, быць настаўнікам паступова знікае...

**Н. БЕДЗЬ.**

## АДБЫЛОСЯ

выступленне артыстаў Дзяржаўнага акадэмічнага хору БССР імя Генадзя Цітовіча перад студэнтамі і супрацоўнікамі універсітэта, школьнікамі, якія ўдзельнічалі ў рэспубліканскай алімпіядзе па беларускай мове і літаратуры.

Спачатку выступіў мастацкі кіраўнік, народны артыст БССР, лаурэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі М. Дрынеўскі. Ён расказаў аб тым, што іх калектыў выконвае не толькі беларускія народныя песні, але і рускія, нават карэйскія. Былі ўжо выступленні хору ў Польшчы, Чэхаславакіі, Карэі, Японіі, у іншых краінах.

Выступленне музыкантаў прысутным спадабалася. Настрой ва ўсіх быў добрым. Мы, гледачы, вельмі ўдзячны гасцям за сустрэчу.

А потым выступалі члены літаратурнага аб'яднання «Надняманскія галасы». Свае вершы чыталі Андрэй Пяткевіч, Едрусь Мазько, Юрась Пацюпа, Юрый Гуменюк і іншыя. Вершы гучалі ўзнёсла, надзённа, хвалявалі думкі і пачуцці.

**Г. ПЛАЎСКАЯ.**

## БЕЛАРУСКАЯ ДУМКА

**Зараз часопісы вяртаюць спадчыну вялікіх рускіх філосафаў: У. Салаўёва, М. Бярдзяева, П. Фларэнскага, Г. Шпета ды іншых. З-за немагчымасці надрукаваць поўныя творы, часамі публікуюць урыўкі, выбаркі з работ. Гэтыя публікацыі «размачнічваюць» нашу свядомасць, зарыентаваную на дагматы, на «вечныя ісціны».**

**Пра беларусаў гавораць, што мы больш народ паэтаў, чымся філосафаў, дый занятыя вечным адраджэннем, змаганнем за элементарныя правы, не так шмат мелі часу сягаць у метафізічныя глыбіні. Але гэта няпраўда, што «беларусы нікога не маюць». Літаб'яднанне «Наднёманскія галасы» пачынае шэраг публікацый «Беларуская думка», — пачынае менавіта з М. Багдановіча, бадай ці не цэнтральнае постаці ў нашай культуры, не толькі паэта, але й першага крытыка, таленавітага публіцыста. Большасць яго работ ёсць у Зборы твораў. Ды, раскіданыя па рэцэнзіях, нататках, думкі яго недаступныя нават філолагам. Таму погляды М. Багдановіча на культуру, адраджэнне ў выбарках прапаноўваем чытачу. Яны ў цяперашняй сітуацыі раставяць многія кропкі над «і».**

**...што такое той «народны дух»! На ім няма ані кляйма, ані пломбы, а таму пад яго пакрыццём, канечне, будуць занасіцца ў нашу пісьменнасць і наследаванні з вялікарускай ды ўкраінскай народнай паэзіі, пад уплыў каторых так лёгка падпасці, і ўласныя нікчэмныя выдумкі, і яшчэ шмат чаго.**

**...баронячы наш народ, мы павінны бараніць і нашу культуру. І што б там ні было, а гмах яе, калісці распачаты, павінен быць збудаваны да канца.**

**...за восем-дзевяць год свайго праўдзівага існавання наша паэзія прайшла ўсе шляхі, а пачасці і сцежкі, каторыя паэзія еўрапейская пратаптывала болей ста год.**

**Беларускіх вершаў у нас яшчэ не было — былі толькі вершы, пісаныя беларускай мовай.**

**М. БАГДАНОВІЧ.**

# М. Багдановіч — крытык, публіцыст



**«...а гмах яе, калісці распачаты, павінен быць збудаваны да канца».**

Бяручыся за характарыстыку і апісанне беларускага нацыянальнага руху, вызначым перад усім суадносіны паміж ім і агульнаеўрапейскім прагрэсам. Асноўныя лініі гэтага апошняга выявіліся цвёрда і ясна: менавіта яны вядуць у бок усё большага і большага павелічэння драблення культур увогуле і літаратур у прыватнасці. Каб пераканацца ў гэтым, дастаткова беглага агляду ланцуга найбольш значных і выразных фактаў з гісторыі еўрапейскіх культур.

Можна паказаць толькі... недарэчнасць тэрміна «культурны сепаратызм»...

Народная душа, раскрываючыся і шукаючы для таго адпаведных форм, выяўляецца ў паэзіі праз такое магутнае з'явішча, як уласнатворная мова, а ў песеннай паэзіі і праз нацыянальны склад вершаў, нацыянальны стыль яго.

Намагаючыся зрабіць нашу паэзію не толькі мовай, але і духам, і складам твораў шчыра беларускай, мы рабілі б цяжкую памылку, калі б кінулі тую вывучку, што нам давала светавая (найчасцей еўрапейская) паэзія.

...наша пісьменнасць няразвітая і каравая, але вялікім пачуццём напоўнена ўсё яе цела, не на грашовых справах трымаецца яна і ніколі не пойдзе чысціць боты капіталу!

Бегла выбіраючы і сумуючы факты, паводле сваёй агульнапрызнанасці спрэчцы непадлеглыя, мы ўпэўніваемся, што беларуская культура ані не з'яўляецца проста варыянтам культуры вялікарускай. Наадварот, у сваім абліччы, перад намі знайходзяцца два самастойныя культурныя комплексы, з самага ж пачатку ростам і развіццём незалежныя адзін ад аднаго. Родныя між сабою і паводле бытавых першаасноў, і паводле ўздзеянняў, накіраваных з вонку, і паводле падзей далейшага гістарычнага развіцця, яны, натуральна, прыйшлі да далёка не адпаведных канчатковых вынікаў.

Справа ў тым, што ўжо к канцу XIII ст. (паводле аўтарытэтнага сведчання праф. Карскага) беларуская народнасць выступае сфармаванаю ў сваіх асноўных рысах, апярэдзіўшы ў гэтых адносінах народнасць вялікарускую, якая, такім чынам, не магла ўздзейнічаць на працэс узнікнення яе.

Што да вялікарускага народу, то ход яго развіцця агульнавядомы. Асіміляваўшы масу фінскіх плямёнаў, засвоіўшы іх прыстасаваны да навакольных умоў бытавы ўклад і, значыць, адхіліўшыся ад спрадвечнага славянства як антрапалагічна, так і культурна, ён у давяршэнне ўсяго перажыў эпоху татаршчыны і апынуўся амаль абсалютна адрэзаным ад Заходняй Еўропы.

Беларускі ж народ, цалкам увайшоў ў Літоўскае гасударства, развіваючыся, як і раней, на старым корані, вытвараючы такім парадкам культуру, незалежную ад культуры вялікарускай і з самага ж пачатку адрожняўшуюся ад яе. Адным з бакоў гэтага развіцця быў узрост беларускай пісьменнасці, каторая з таго часу патроху становіцца на пэўны грунт.

Першае, што тут кідаецца ў вочы — гэта брак паэтычных твораў, усюды раджаючыхся толькі ў кашульцы роднага слова.

Але замацаванне і развіццё старых культурных асноў з'явілася ўсяго адным бокам у працэсе наступальнага руху беларускай нацыянальнасці. Можа быць, менш буйное значэнне мела збліжэнне з Заходняй Еўропай, з якою яна здаўна вяла ажыўленыя зносіны дзякуючы сувязям як геаграфічным, так і эканамічным. Гэтае збліжэнне тым больш варта адзначыць, што менавіта з гэтай пары ў выпрацоўцы беларускай культуры ўдзельнічае не толькі шэрая вёска, але і гандлёвы горад еўрапейскага тыпу, горад, арганізаваны на асновах магдэбургскага права. Ён зрабіў беларускую культуру больш маляўнічаю, шматгранною, увёў яе ў ход Заходнеяеўрапейскага жыцця і стаў, такім чынам, перадавым фарпастом Заходняй Еўропы на ўсходзе.

Аднак, наўслед за апісаным «залатым векам» у гісторыі беларускай культуры пачаўся перыяд упадка. Межавым каменем паміж імі з'яўляецца дата знішчэння ў дзяржаўным абароце Вялікага княства Літоўскага карыстання беларускай моваю і замена гэтай апошняй польскаю.

Толькі асноўныя першапачатковыя элементы культуры (накшталт мовы, звычаяў, і да т. п.) утрымліваў ён (народ—Ю. П.) за сабою, а ўсё астатняе, само па сабе, гэтак бы мовіць «цымус» яго папярэдняга развіцця, было асімілявана, уваброна ў сябе польскаю культураю і з гэтых часоў фігуруе пад польскаю шыльдаю, будучы па сутнасці беларускім.

Некалькі падтрымлівала беларускую культуру ўніяцкае святарства, бо вунія была распаўсюджана амаль выключна сярод простага народу і з'яўлялася ў краі як бы нацыянальнаю беларускаю рэлігіяй. Пачынаючы з канца XVIII стагоддзя ўніяцкім святарствам на беларускай мове гаварыліся казані, выдаваліся рэлігійныя песнапенні і да т. п. Апошняй праявай гэтай дзейнасці з'яўляецца выдадзены ў 1837 г. беларускі катэхізіс; праз два гады адбылося ўз'яднанне ўніятаў, катэхізіс спалены, казань на беларускай мове забаронена.

...у 40-х гадах мінулага стагоддзя мы спатыкаемся з гняздом мерапрыемстваў, якімі імкнуліся дабіць беларускую культуру...

Міжволі пытаешся: хто ж больш зрабіў дзеля апалячвання беларусаў — паланізатары ці «русіфікатары»?

...падняцце ўзроўню беларускай народнай культуры — было магчыма адно пры наяўнасці шырокіх інтэлігентных сіл, але ў Беларусі культурны слой насельніцтва складаецца, па-першае, з чыноўніцкага балота, дзе задаюць тон агульнаімперскія адкіды, якія робяць сабе тут на нацыянальна-рэлігійным цкаванні кар'еры, па-другое, з польскіх нацыяналістаў, нарэшце, па-трэцяе, з гэбрэйскай буржуазіі.

Беларускай інтэлігенцыі не было, і яе неабходна было выпрацаваць. Гадавальнікам для яе і з'явілася «Наша ніва».

На наш погляд, усякі інтэлігент неабходна мусіць здавальняць наступным запатрабаванням: па-першае, ён павінен мець імкненне да ведаў, па-другое, ён павінен імкнуцца несці свае веды на карысць народу.

Так, напрыклад, мы самі падкрэсліваем, што гэтая формула пакідае прафесара, служку інтарэсаў буржуазіі, па-за інтэлігенцыяй, і ў той жа час можа ўключыць у яе, скажам, напаўпісьменнага рабочага з адпаведнаю духоўнаю закваскай. Скажам больш, — менавіта ў гэтай рысе мы бачым найбольшую каштоўнасць прапанаванага намі азначэння.

Значыць, тыя слаі насельніцтва, якія пераважна вылучалі са свайго асяроддзя інтэлігенцыю, зараз яе не вылучаюць, або дакладней, вылучаюць у шмат меншай колькасці.

...гонар вылучэння са свайго асяроддзя інтэлігенцыі ніколі не быў замацаваны за нейкім класам, і спакваля перайходзіў ад аднаго да другога, няўхільна набліжаючыся да дэмакратычных слаёў насельніцтва.

Гэты сцяг ад дваранскае інтэлігенцыі перайшоў да інтэлігенцыі сярэдніх слаёў і, трэба меркаваць, будзе скора аддадзены гэтаю апошняю ў рукі з'яўленае ёй на змену інтэлігенцыі працоўнае, г. з. сялянскае і рабочае.

Заслугі папярэдніх пакаленняў рускае інтэлігенцыі вялікія і неаспрэчныя. Аднак варта прызнаць, што імкненне несці свае веды на карысць народу было здзейснена ёю далёка не ў той ступені, якой вымагала яе маральнае стварэнне.

Новы слой інтэлігенцыі, які адкладаецца на нашых вачох, мае абсалютна іншую афарбоўку. Ён утварыўся з элементаў, праўда, менш складаных, і менш культурных, але затое больш дзелавых, больш здаровых і працаздольных.

...нацыянальныя рухі — вынік творчасці народнае інтэлігенцыі, народжанае пасля 1905 года; менавіта ў гэты час пачалося, ці прынамсі набыло асаблівую шырыню, адраджэнне... народнасцей...

Глыбока дэмакратычным з'яўляецца і беларускі рух. Створаная ім літаратура не толькі ідзе амаль выключна ў народ, але і ў значнай ступені з'яўляецца прадуктам дзейнасці самога народа ці, дакладней, узнікла ў яго нетрах інтэлігенцыі. Такога ж складу інтэлігенцыя адыгрывае адметную ролю і ў літоўскім і ў украінскім нацыянальным адраджэнні.

Яна ж канчаткова замацавала і дэмакратычнае аблічча яго ідэялогіі. Беларусі народ (як яго інтэлігенцыя) цалкам належыць да працоўных класаў насельніцтва. Таму абарона і падкрэсліванне нацыянальных правоў беларускага народа ёсць абарона і падкрэсліванне правоў працоўнага слою края. Паняцце «нацыя» і «дэмакратыя» у дадзеным выпадку дакладна супадаюць. Гэта пазбавіла беларускі рух ад паталагічных бакоў гэтак нярэдкіх у нацыяналізме шматкласавых народаў. Абараняючы інтарэсы свайго народу і кладучы ў аснову гэтае дзейнасці наяўнасць самастойнае беларускае нацыянальнасці і беларускай культуры, беларуская інтэлігенцыя ніколі не ўпадала ў шавінізм, не імкнулася да ўмалення правоў суседніх нацыянальнасцей на ўсю паўнату самастойнага культурнага развіцця. У прыватнасці, яна вітае рост як вялікарускае, так і польскае культуры ў краі, дабіваючыся толькі таго, каб гэты рост не меў сабе за аснову дэнацыяналізацыю беларускага народу.

Нацыянальныя дамаганні беларускага руху элементарныя і невялікія, далей аўтаноміі Беларусі яны не ішлі, ды і гэтае апошняе патрабаванне ніколі з настойлівасцю не вылучалася. Улаўленне беларусаў ва ўсякага рода «измах» з'яўляецца заработкам...

Перад усім, вельмі спрэчным уяўляецца мне сцверджанне ...што спробы падняць беларусаў на ўзровень самастойнае нацыі аказаліся няўдалымі. Дакладней адваротнае: яны былі надта ўдалыя: нягледзячы на адміністратыўныя праследы, цкаванне з боку рускіх і польскіх шавіністаў і да таго падобныя ўмовы.

Што да практычных планаў... то ў іх вельмі дзіўная адна акалічнасць: калі паланізацыя патрэбная для беларускага народа, то чаму... толькі для беларусаў-католікаў, а не для ўсяго беларускага народа цалкам? І, наадварот, калі яму неабходна русіфікацыя, то чаму яна непажадана сярод беларусаў, якія прытрымліваюцца каталіцтва? Бо ж розніца ў веравызнаннях не расколвае беларускі народ на дзве непадобныя паводле культуры велічыні. Бо ў беларуса, а ці ён католік ці праваслаўны, адзін і той жа псіхічны тып, мова, бытавы ўклад.

... напрыклад, у Віленскім, Лідскім і Ашмянскім уездах Віленскае губерніі колькасць палякаў паказана ад 50 да 100%, у Дзісенскім, Вілейскім і Свенцяцкім — ад 30 да 50%, у Мінскім — таксама, у Дрысенскім (Віцебская губ.) — ад 20 да 30% і г. д. Складаецца ўражанне, што гэта польскі край толькі памылкова названы Беларуссю. А між іншым, тут жыве суцэльнае беларускае (калі-некалі літоўскае) насельніцтва, палякі ёсць адно ў гарадох ды ў польскіх маёнтках; нарэшце да палякаў з вялікаю нацяжкасцю можна было б аднесці і гэтак званую «засцянковую шляхту», ды і толькі.

Пры навучанні па-вялікарускі з ужытку беларускага дзіцяці выкрэсліваецца многа своеасаблівых, чыста беларускіх слоў, вобразаў, зваротаў і, значыць, усе звязаныя з імі жывыя, ясныя і звыклыя ўяўленні і перажыванні.

...Феадосія...

Насельніцтва тут у нацыянальных адносінах вельмі пярэстае, рознапляменнае, і ў яго ўсяго адна агульная глеба — руская. Сотню гадоў сюды ўкараняюць рускую мову школа, кніга, газета, дзяржаўныя і грамадскія ўстановы... І ўкараняюць не марна — руская мова тут зрабілася агульнаўжывальнаю. Але вось колькі фраз, чутых мною ад асоб, прыналежных да інтэлігентных слаёў грамадства: «Знаетесь вы на греческой литературе?..», «Я скучаю за ним (по нем)..», «Я говорю за мои туфли», «Я хвораю на чахотку», «У меня пара курей» і г. д. Маё «і г. д.» павінна хаваць сабою мноства ўсялякіх недарэчнасцей і — этымалагічных і сінтаксічных і слоўных, якімі густа насычана мясцовае маўленне. Гэта плата за асіміляцыю, за страту свае нацыянальнасці. Мяркуецца, што ўзамен будзе дадзена руская мова. У сапраўднасці можна атрымаць толькі агідны жаргон, які можа быць базісам для чаго заўгодна, але не для культурнага будаўніцтва, не для росту духоўных каштоўнасцей.

**Выбаркі з работ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА падрыхтаваў і скампанаваў ЮРАСЬ ПАЦЮПА.**

## *Папраўка*

**У мінулым нумары газеты па віне рэдакцыі дапушчана памылка. У заметцы А. Іванова «Выпускаем добрых інжынераў» чытайце: «Толькі за апошнія чатыры гады сіламі нашых супрацоўнікаў выкананы дагаварныя работы з агульнай сумай засваення больш 1 мільёна рублёў...».**

Наш адрас: 230023, г. Гродна, вул. Ажэшка, 22, пакой 404, тэл. 44-80-70

Газета выходзіць штотыднёва

Гродзенская абласная ўзбуйненая друкарня вул. Паліграфістаў, 4.

Тыраж 2000 экз.

Зак. 3238. АИ 05126.

Рэдактар Л. С. ЗАСЕЛЬСКАЯ.